http://edoc.bseu.by

Рассматривая содержание профессионально важных качеств государственных служащих, не обойти вопрос ценностно-смысловой сферы личности профессионала. Зрелая ценностно-смысловая сфера личности профессионала необходимо входит в структуру его профессионально важных качеств.

По мнению Б.Г. Ананьева, человек становится таким, каким его делает жизнь в определенных обстоятельствах. Человек, однако, не является пассивным продуктом общественной среды или жертвой генетических сил. Создание и изменение обстоятельств есть проявление социальной активности человека.

Под профессиональной деятельностью государственного служащего понимается социально зафиксированная обществом область трудовых действий, для выполнения которой человек должен обладать суммой знаний и навыков, иметь соответствующие способности, профессионально важные качества личности, а под профессионально важными качествами понимаются качества субъекта, включенные в процесс деятельности и влияющие на эффективность ее выполнения по основным показателям.

Таким образом, для осуществления профессионально-управленческой деятельности государственных служащих необходим ряд профессионально важных качеств. Это мотивационная направленность на соблюдение государственных законов и интересов граждан, организаторские способности, эмпатия и другие. В зависимости от специфики и направления государственной службы, преобладающее значение приобретают разные профессионально важные качества, различные профессионально важные качества будут находится под наибольшей нагрузкой. Отсюда большая актуальность постановки проблемы возможности их развития в процессе инновационной подготовки кадров.

Литература

1. Ананьев, Б.Г. Избранные психологические труды / Б.Г. Ананьев. – В 2-х томах. – Т. 1. – М., 1980. – С. 286.

2. Психология профессиональной деятельности кадров государственной службы. М., РАГС. – 1997. – С. 321.

***І.В. Грабянчук***
*(Беларусь, Бабруйск)*

## ПРАВАВЫЯ ВЕДЫ Ў ПРАФЕСІЙНАЙ КАМПЕТЭНТНАСЦІ СУЧАСНЫХ ЭКАНАМІСТАЎ

Прафесійную кампетэнтнасць выпускніка любой эканамічнай спецыяльнасці неабходна разглядаць як сукупнасць кіраўнічых, эканамічных, прававых, этычных, сацыяльна-псіхалагічных ведаў і ўменняў, якія фарміруюць у яго здольнасць да крэатыўнага мыслення, гатоўнаць рызыкаваць, браць на сябе адказнасць за прынятыя рашэнні і інш.

Неабходна адзначыць, што роля прававых ведаў у прафесійнай кампетэнтнасці эканамістаў яшчэ не атрымала належнай глыбокай распрацоўкі ў даследаваннях па педагогіцы вышэйшай школы ў Беларусі і краінах СНД.

Гэта можна растлумачыць дастаткова складанымі метадалагічнымі праблемамі дакладнай дыферэнцыяцыі кампетэнцыі дзвюх самастойных галін навуковых і практычных ведаў і адначасова неабходнасцю іх пэўнага сінтэзу.

Для раскрыцця заяўленай тэмы возьмем за аснову параўнаўчую характарыстыку прафесійных кампетэнцый эканаміста і юрыста, прыведеную ў артыкуле расійскай даследчыцы Н. П. Сімаевай [1]:

| Прафесійная кампетэнтнасць эканаміста | Прафесійная кампетэнтнасць юрыста |
|---|---|
| Ведаць эканамічныя законы і прынцыпы, заканадаўства | Ведаць дзеючае заканадаўства і усе іншыя крыніцы права |
| Умець узгадняць эканамічныя інтарэсы | Умець спалучаць публічныя і прыватныя інтарэсы |
| Умець вызначаць эканамічную эфектыўнасць, рабіць эканамічныя разлікі | Умець вызначаць меру адказнасці да канкрэтнага казусу |
| Валодаць метадамі эканамічнага і фінансавага аналізу | Ведаць правапрымяняльную практыку ў цэлым і судовую ў прыватнасці |
| Умець прымяняць матэматычныя і статыстычныя метады да вырашэння эканамічных задач | Умець у магчымых абставінах прымяняць заканадаўства і свабодна арыентавацца ў яго іерархіі |
| Умець складаць, чытаць і аналізаваць першасныя дакументы | Умець складаць дагаворы і дакументы працэсуальнага характару і ўмець праводзіць іх прававую экспертызу |
| Валодаць навыкамі работы з праграмным забеспячэннем вядзення эканамічнай і фінансавай справаздачнасці | Мець дакладнае ўяўленне аб працэсуальных дзеяннях пры судовых і пазасудовых разбіральніцтвах |

У прыведзенай характарыстыцы дастаткова поўна прыведзены пазіцыі, дзе кампетэнцыі эканамістаў і юрыстаў найбольш шчыльна зближаюцца. Відавочна, што для іх поўнай рэалізацыі неабходна ўсебаковая сацыялізацыя асобы, паколькі ад гэтага будзе залежаць эфектыўнасць працы і эканамістаў і юрыстаў.

З мэтай складання агульнага ўяўлення аб тым, як ўспрымаюць ролю прававых ведаў у сваёй прафесійнай дзейнасці маладыя эканамісты, намі было праведзена апытанне выпускнікоў скарочанай формы навучання па спецыяльнасцях “Бухгалтарскі аналіз, улік і аўдыт” і “Маркетынг” Бабруйскага філіяла Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта.

Першае пытанне было сфармулявана так: “ Вылучыце некалькі прававых пытанняў, у якіх, на вашу думку, павінен быць кампетэнтным сучасны эканаміст”. Найбольшая колькасць адказаў была прысвечана пытанням працоўнага права: заключэнне, змяненне, спыненне працоўных дагавароў і кантрактаў, ахова працы, разлікі па яе аплаце і дадатковых выплатах. Другую пазіцыю падзялілі пытанні грамадзянскага права і гаспадарчага права. Найбольш актуальнымі для сучаснага эканаміста рэспандэнты вызначылі праблемы захавання права ўласнасці (у тым ліку раўнапраўя дзяржаўнай і прыватнай форм уласнасці), правоў спажыўцоў, заключэння і выкання грамадзянска-прававых, гаспадарчых дагавароў. На трэцім месцы – тэмы адміністрацыйна-прававой адказнасці і цэнаўтварэння. Відавочна, што такое спалучэнне атрымалася не выпадкова, паколькі для суб’ектаў гаспадарання

найбольш пашыраная форма юрыдычнай адказнасці за парушэнне заканадаўства аб цэнаўтварэнні наступае якраз па нормах адміністрацыйнага права.

Другое пытанне мела гіпатэтычны характар, скіраваны на выяўленне патэнцыялу мыслення выпускнікоў у маштабах інтарэсаў грамадства і дзяржавы: "Калі б вы былі дэпутатам парламента, то што вы змянілі б ці дапоўнілі б ў дзеючым заканадаўстве?" У дадзеным выпадку таксама найбольшую вагу атрымаў блок адказаў, звязаных з выкананнем норм працоўнага права, а таксама тых аспектаў сацыяльнай палітыкі дзяржавы, рэалізацыя якіх непасрэдна ўплывае на эфектыўнасць працоўнай дзейнасці грамадзян. Да апошніх адносяцца: праблемы працаўладкавання моладзі і спыненне яе эміграцыі за мяжу з-за нізкага ўзроўню даходаў; вырашэнне праблемы будаўніцтва жылля для маладых сем'яў, а таксама сем'яў з непаўналетнімі дзецьмі; пенсійнае забеспячэнне ў залежнасці ад працоўнага стажу і інш. Цікава таксама адзначыць, што выказваліся думкі аб неабходнасці павелічэння працягласці працоўнага адпачынку.

Пашырэнне дзелавой актыўнасці рэспандэнты звязваюць з ростам колькасці прыватных прадпрыемстваў і узмацненнем ролі прыватнай уласнасці ў гаспадарчай дзейнасці, удасканальваннем арэндных адносін, зніжэннем падаходнага падатку, а таксама спрашчэннем сістэмы падаткаабкладання ў цэлым.

Не абыякавыя выпускнікі БФ БДЭУ да пытанняў экалагічнай бяспекі. Была нават выказана радыкальная прапанова вінаватых у забруджванні навакольнага асяроддзя прыцягваць да крымінальнай адказнасці і "караць тэрмінам, а не штрафам". Заслугоўвае ўвагі ідэя прыняць спецыяльны закон аб абавязковай утылізацыі смецця. У адным з адказаў прагучала думка, што неабходна больш паслядоўна выконваць Закон "Аб жывёльным свеце": увесці больш строгую адказнасць за незаконнае паляванне, забараніць выкарыстанне пастак.

Нарэшце, рэспандэнты выказваліся за неабходнасць скарачэння бюракратычнага апарату, вядзення барацьбы з карупцыяй. Яны негатыўна ацанілі факты пераводу на іншыя, менш значныя дзяржаўныя пасады чыноўнікаў, якія скампраметавалі сябе супрацьзаконнымі дзеяннямі, без прыцягнення іх да юрыдычнай адказнасці.

Трэцяе пытанне таксама было гіпатэтычнага плану і мела на мэце выяўленне грамадзянскай пазіцыі студэнтаў, узроўню развіцця іх нацыянальнай самасвядомасці: "У выпадку неабходнасці пераходу на беларускую мову ў вядзенні справаводства як бы вы ацанілі сваю падрыхтаванасць да гэтай справы па пяцібальнай шкале? Калі вы лічыце, што ваш узровень падрыхтаванасці недастатковы, то колькі часу вам спатрэбілася б на поўнае вырашэнне гэтай задачы?" Тут самы часты адказ – ацэнка сваёй гатоўнасці на "3" балы і нават ніжэй. Толькі 4 рэспандэнты з 38 ацанілі сваю гатоўнасць да такой справы на "4" балы (на "5" адказаў не было). Адносна сваёй пантэнцыйнай гатоўнасці выканаць пастаўленую задачу на працягу пэўнага адрэзку часу даваліся розныя адказы: ад 1 тыдня(!) да 4-5 гадоў ("нямала часу"). Такі звышаптымізм асобных

выпускнікоў, магчыма, выказаны пад уплывам спадзяванняў на ўсемагутную сілу навукова-тэхнічнага прагрэсу – наяўнасць Інтэрнэту, сістэм перакладаў тэкстаў у ім і інш. Рэспандэнты асцерагаюцца складанасцяў пераводу на беларускамоўнае справаводства, але большасць апытаных разумее неабходнасць пашырэння выкарыстання беларускай мовы ў штодзённым жыцці і выхавання паважлівых адносін да яе.

Такім чынам, для сучасных эканамістаў актуальнымі з'яўляюцца не толькі веданне і разуменне дзеючага заканадаўства, але і аб'ектыўныя меркаванні аб праве як адной з фундаментальных навуковых катэгорый і сацыяльнай каштоўнасці. Не менш важнай уяўляецца іх актыўная праца па ўмацаванні законнасці і правапарадку ў эканамічнай сферы. Адпаведна, прававая адукацыя ў эканамічнай вышэйшай навучальнай установе павінна быць накіравана на атрыманне яе выпускнікамі належнага ўзроўню прававой падрыхтоўкі.

Літаратура

1. Симаева, Н.П. Профессиональные компетенции студентов экономических и юридических специальностей: общее и особенное в содержании и условиях формирования / Н.П. Симаева // Вестник ВолГУ [Электронный ресурс]. – 2010. – Серия 6. – Вып. 12. – Режим доступа: http://new.volsu.ru/upload/medialibrary/3e4/2_Simaeva.pdf. – Дата доступа: 24.01.2013.

***В.В. Ивчик***
*(Беларусь, Горки)*

## МАГИСТРАТУРА В АГРАРНЫХ ВУЗАХ: ОПЫТ СОЦИОЛОГИЧЕСКОГО ИССЛЕДОВАНИЯ

В сфере отечественного высшего аграрного образования магистратура является второй ступенью высшего образования и необходимым этапом обучения перед аспирантурой. Ее цель – подготовка специалистов для научной и педагогической деятельности в высшей школе, работы в органах государственного управления.

Согласно статье 202, п.5 Кодекса Республики Беларусь об образовании: «На II ступени высшего образования (магистратура) обеспечиваются углубленная подготовка специалиста, формирование знаний, умений и навыков научно-педагогической и научно-исследовательской работы с присвоением степени магистра.

На II ступени высшего образования реализуются образовательная программа высшего образования II ступени, формирующая знания, умения и навыки научно-педагогической и научно-исследовательской работы и обеспечивающая получение степени магистра, и образовательная программа высшего